**Віктар Шніп**

# Пошук радасці

Вершы

Мінск
“Мастацкая літаратура”
1987

x x x

Дрыготкія
Зоры Сусвету
Сягоння нам верацъ яшчэ.
Пасадзіш ля рэчкі
Бярозу,
І стане крыніцы лягчэй.
І радасна птах асцярожны
Садзіцца
Табе на руку.
Калі зберагаеш
Крыніцу—
Зямлі зберагаеш
Раку.

x x x

Асвяціла нябёсы
Маладая трава.
І самота па птушках
На ўсё лета—бывай.
А на прызьбе старыя
Зноў размовы вядуць
Пра былыя палеткі,
Пра лясы, пра ваду.
І ўсё хваляць былое.
--Нам, хлапец, не пярэч.
Ды і самі сціхаюць—
Жаўрук слова бярэ.
У старога слязінка
Асвяціла шчаку.
Нібы добраму госцю,
Кожны рад жаўруку.
Я праз сад прамяністы,
Зняўшы шапку, іду.
Неспакойныя думкі
Пра лясы, пра ваду…

x x x

А талент ад душы,
Не ад святога духу.
А без душы паэт,
Нібы рака без руху.

Век пражывеш, як дзень,
А дзень, як век, бясконцы.
Не ўсё, што хваляць—цуд,
Не ўсё, што свеціць—сонца.

Вякі перажыве
І зойдзе ў кожну хату
Не той, хто скажа шмат,
А той, хто скажа праўду.

x x x

Рыпіць старэнькі калаўрот—
Вецер укруціўся ў спіцы.
Ля матулі дрэмле кот.
Час цячэ па белай ніціцы.
Сонца села за акном
У стажок на загуменні.
І ў матулі на ўвесь дом
Свецяць з-пад рукі праменні.
Цемра ўхутала сяло.
Светла ў нас.
Мы не заснулі.
Пэўна, дзённае святло
Спрадзена ў клубок матуляй.

x x x

Адвечныя думы зямныя
Зямнымі ў нас будуць штовек,
Пакуль за дабро чалавеку
Прыносіць дабро чалавек.

Загубленым дрэвам—быць тленам,
Пасаджаным дрэвам—расці.
Пра што і не думаем сёння,
Адкрыем у мірным жыцці.

І сеем мы жыта і праўду,
Іх сеяць мы будзем павек…
І верыць Зямля чалавеку,
І верыць Дабру чалавек.

х х х

Ён прыходзіў штодня да ракі
І удалеч з абрыву глядзеў.
Ён не чуў, як пяюць жаўрукі,
І не бачыў святла на вадзе.

Там удалечы ўдумлівы гай
Пра вясну і пра сум гаманіў.
Ён жа чуў адно слова “чакай”,
Што чакаў, тое знікла ў агні.

Не заўважыў, як знікла рака,
Як ссівела—уся галава.
Ён жанчыну чакаў,
Не стрываў
І падаўся па свеце шукаць.

Я не ведаю. Дзе ён хадзіў.
Я не ведаю, як ён шукаў.
А вярнуўся, ён сад пасадзіў,
Стаў глядзець сірату-хлапчука.

ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Ён сядзеў каля дарогі,
Як туман, увесь сівы.
--Бурачок, ты ж пахаваны.
--Дудка грае—я жывы.

--Падкажы мне, што іграці?
--Грай, што маеш на душы,
Толькі ад няшчырай песні
Дудку, браце, беражы.

І пайшоў ён па дарозе,
Як туман, увесь сівы.
--Бурачок жа пахаваны.
--Дудка грае—ён жывы.

x x x

Яшчэ хапае ў свеце зла,
Нібыта пустазелля ў жыце.
Калі вы хочыце дабра,
Дабро тварыце.

І прыйдзе той жаданы дзень,--
Адной сям'ёй жыць будуць людзі.
Няхай ужо й не будзе нас,
Айчына будзе.

Чаго на свеце не было!
Ды не было вось так трывожна.
Як мы не пераможам зло.
Хто ж пераможа?

x x x

Сонцу вечна ўзыходзіць над намі,
Не рассыпацца слову на гукі.
Да зямлі дакрануся рукамі—
Падужэюць адразу рукі.
Ад карэння да кроны ў небе
Неспазнанае з часам спазнаем.
З працай, з думай святой аб хлебе,
Як і свет, самі вечнымі станем.
Плач матуль і дзяцей мы чуем,
Без душы чалавек—не пачуе.

Мы Зямлю ад агню ўратуем,
Нас Зямля ад агню ўратуе.

## КУЗЬМА

Яму здаецца—быў малы учора.
Не ўспеў агледзецца, а ўжо—стары.
Як ён хацеў павандраваць па свеце!
Ды ўсё жыццё пратупаў па двары.

Суседка просіць:
--Пакасі дзялянку...
Другая просіць:
--Навастры пілу...
І ён ідзе, і пра яго гаворкі,
Хутчэй чым сам ён, ходзяць па сялу.

Здаецца, яшчэ свецяць промні ранку,
А ўжо і гэты затухае дзень.
Ступае дзед з касою на дзялянку,
Расцягваецца цяжкі цень.

## ДЗЯДЗЬКА МІКОЛА

Нам Мікола робіць печ.
--Будзе проста любата
Для старых і для малечы,
Хопіць месца й для ката.

Пару дзён—і печ стаіць.
І цяпло жыве у ёй.
--Як табе нам адплаціць?
--Грэцца забягу зімой.

І пакуль не выпаў снег,
Печы ладзіць у людзей.
А ў самога, проста смех,
З печы дым на хату йдзе.

## ХВЕДАР

Ад ранку ля паветкі
Пілуе Хведар дровы,
Паношаную шапку
Насунуўшы на бровы.

Заморыцца, пакурыць,
Пагутарыць з сабою.
Глядзіш, ізноў пілуе—
Няма яму спакою.

І як тут не паможаш
Самотнаму суседу?
--Чаму ж не едуць дзеці?
--Памру, тады прыедуць…

x x x

Ужо каторы дзень
Жанчыны бручку полюць.
Канца траве няма,
Хоць ты начуй на полі.

І дома ў агарод
Пракралася макрыца.
Жанчынам гаварыць
І не нагаварыцца.

А вернуцца дамоў,--
У агарод адразу.

Які бясконцы дзень!
Ды не хапае часу.
Кругом усё бягом.
--Мы адпачнём зімою.

…На поле зноў ідуць,
І поле за спіною.

x x x

Нам не належыць гэты свет,
Мы свету гэтаму належым.
У вёсачцы жыве паэт,
Жыве, сумуе па бязмежжы.
Вандроўнік вецер прыляцеў:
--Давай махнём да зор з табою!
Не паляцеў, хоць і хацеў—
Ён да зямлі прырос душою.

x x x

Хата анямелая, сівая,
З шэраю буслянкай, бы вянком,
Вокнамі задумна пазірае,
Склаўшы рукі на дзвярах замком.
1980

x x x

Не чутна даўніх песень
На полі ды на лузе.
Прашу, каб мама спела,
Ніяк не дапрашуся.
Ды зрэдку, у застоллі
Старое заспяваюць.
Усе спяюць пачатак,
Ну а канца—не знаюць.

x x x

Засыпалі ў вёсцы калодзеж—
Рабілі шырэйшай дарогу.
Дарога шчэ больш павузела,
Не бачна на ёй анікога.

--Такую ваду загубілі!..

За плотам дзядзькі неглухія:
--Прыехаў, спяшайся дахаты.
У справы не сунься чужыя.

Ды раптам дзядзькі заціхаюць,
Расходзяцца, нібы нямыя.
Ідзе па дарозе старая,
Пазвоньваюць вёдры пустыя.

## НАВАЛЬНІЦА

Як з прывязяў, з маланак
Зрываюцца грамы.
Ля хат раўчук балбоча,--
А ў весну быў нямы.

Жаўцюткі пыл дарогі
Апаў, нібы патух.
Схаваўся ў студню ранак,
Да дна звініць ланцуг.

Стаіць на ганку дзядзька,
Задумаўся, відаць.
Маршчыны размывае
Туманная вада.

## ДОМА

І светла, і змрочна на сонным гарышчы.
У чорным цабэрку бялее мука,
І вецер вільготны праз шчыліны свішча—
Калыша гняздо павука.

На доўгім шасце залацее цыбуля,
І свецяцца яблыкі ў цесных кашах.
Запылены нож, што забыла матуля,
Ляжыць на каляных мяшках.

Гляджу я на ўсё, нічаму не дзіўлюся.

Здзіўляцца, напэўна, часіна прайшла.
Да вобразаў гэтых душою імкнуся,
Нібыта бліжэй да святла.

х х х

Мы шмат абяцаем,
І нам абяцаюць.
Мы шмат забываем,
І нас забываюць.
Так звеку вядзецца.
А хто перайначыць?
І моцны ўсміхнецца,
І кволы заплача.

ЛЯ КАСТРА

З дрэў асыпаецца лісцё
Спазнаць зямную цішыню.
Прыйшоў хлапчук, насупраць сеў,
Сказаўшы "добры дзень" агню.
Гаркавым дымам над зямлёй
Паціху коціцца наш час...
Яднае нас цяплом агонь
І раздзяляе дымам нас.

х х х

Ад ветру у фортцы
　　　　　　　　разбілася шыба,
Пад столь
　　　　　занавеска
　　　　　　　　　сцюдзёна трапеча.
У неба ўрастае
　　　　　　　галінамі ліпа,
У травы ўрастае
　　　　　　　　туманамі вечар.

Як белыя птушкі,
ўзляцелі паперы,
І стол апусцеў,
нібы бераг ад стрэлу.
Са злосцю на шум
зачыніліся дзверы,
І стала падлога
па-снежнаму белай.

Я фортку зашкліў—
яшчэ холадна ў лецe,
Па месцах расклаў
і паперы, і рэчы.
На самым світанні
заціх буйны вецер,
Ды ліпа шуміць,
занавеска трапеча.

x x x

Гайнёю быстраю ляціць
За мной мяцеліца сівая.
Пакуль дамоў ваду нясу,
Вада у вёдрах замярзае.

А снег глыбокі, і—зіма.
Стаяць аціхлыя рабіны--
У іх, на ўзгорку за сялом,
Прымерзлі да нябёс галіны.

Рыпяць, спяваюць пада мной
У сенцах выстылых масніцы.
Ваду стаўляю,
а вядро
Не адпускае рукавіцу.
9.11.1983

x x x

У рэчцы вымерзла вада.
І рыбы ў лёдзе, нібы зоры.
--Не помню я такой зімы,--
Дзед стогадовы ўсім гаворыць.

Віюцца над сялом дымы.
Над імі грэюцца аблокі.
Па вуліцы дамоў ідзеш,
І следам, нібы смнег, сарокі.

Усё імкнецца да цяпла.
Цяпло сябе не зберагае.
У рэчцы вымерзла вада,
Крыніцу лёд трымае.

x x x

Праз лес я ехаў нейк уранні.
Напала на мяне завея,
Схапіла шапку і памчала.
Хацела ўзяць каня і сані.

Наўцёкі я хутчэй дадому.
Завея, свішчучы,-- па следзе.
Ракамі белымі хапала
З саней, як золата, салому.

x x x

Сумую па ўсмешках,
Якія пад смехам.
Сумую па сцежках,
Якія пад снегам.

x x x

Сыходзіць снег, змывае смецце,
Што засталося ад зімы.
Шырока адчыняем дзверы—
Глыбока дыхаюць дамы.

І ўжо хутчэй плывуць аблокі,
Нібы адталі ад нябёс.
У поле шэрае з-пад снегу
Дарогі парастак прарос.

І чалавек ідзе на поле,
І небакрай—яго мяжа.
І поўняцца блакітам вочы
І клопатам пра хлеб—душа.

x x x

Захочаш крычаць—толькі рэху пачуць.
І станеш маўчаць, хоць маўчаць немагчыма.
Не клікнуць сяброў, сябры самі ідуць.
І мне не хавацца у іх за плячыма.

Мне шмат абяцалі, і я абяцаў,
Ды ўсе абяцанні—наіўным уцеха.
Я мала знаходзіў, я многа губляў,
Дзе можна пад’ехаць, ішоў, а не ехаў.

Сяброў не чакаю, як свята чакаць.
Яны недзе ходзяць, ды гэтага мала.
Як часта па свеце я радасць шукаў,
Яна мяне дома заўсёды чакала.

x x x

Мы касцёр распалілі. Гаворым
Пад аховай аблокаў начных.
У нябёсах таемныя зоры,

І зарніцы між дрэў векавых.

Зноў бяроза шуміць. Не заснула.
Ля дарогі палын у журбе.
--Ці ты чуеш, нас кліча матуля?
--Пэўна, гэта здалося табе.

Праляцеў устрывожаны вецер,
Да зямлі прыгінаючы дым.
Поўня знікла за хмарай. Не свеціць.
Дагарае касцёр. Мы маўчым.

## НЕВЯДОМАЙ ДЗЯЎЧЫНЕ

Шукаў я цябе—не знаходзіў
І часам баяўся знайсці.
Ты недзе жывеш і шукаеш
Мяне ў гэтым тлумным жыцці…

Шукаю цябе—не знаходжу.
Мне кажуць: “Знайсці, брат, пара…”
Там светла,
дзе ты пабывала,
Там цёмна,
дзе ты не была.

## х х х

На небе маладзік слязой.
Сляза акамянелая
У леса над душой вісіць.
Душа— чаромха белая.

Спявае ў лесе салавей.
Сава з вятрыскам жэняцца.
--Як пасялю яго ў дупле,
Нікуды не падзенецца.

А ўжо на ўсходзе за ракой

Усходзіць кветка раніцы.
І брамка на бацькоўскі двор
Ніяк не адчыняецца.

х х х

Я намаляваў цябе
Крэйдаю на асфальце.
Ішоў дождж
І забраў твой воблік.
Я выразаў на дрэве
Тваё імя.
Прыйшлі дрывасекі
І ссеклі дрэва.
Я высек твой воблік
На камені.
Будавалі хату
І камень паклалі
У падмурак.
Тады я напісаў
Верш, прысвечаны табе.
Можа,
Застанецца...

х х х

Вы помните, вы всё,конечно, помните...
Сяргей Ясенін

Я вас даўно забыў,
І вы мяне забылі.
Я вас тады любіў,
Мяне вы не любілі.

Хадзіў, нібы п’яны,
Складаў уголас вершы.
Пра вас былі яны,
Апошні верш і першы.

Даўно ўсё так было,
Але было калісьці.
І ваша ёсць сяло,
І вершы засталіся.

Я вас тады любіў,
Мяне вы не любілі.
Я вас амаль забыў,
А вершы не забылі.

x x x

Дзе, дзе раней ты была?
Дзе я раней тады быў?
Дзічка ў гародзе цвіла,
Лебедзь за лодкаю плыў.

Ветру у полі вальней,
Поле ў жыццё шырынёй.
Што нас чакае далей?
Што мы чакаем з табой?

Хочацца болей святла.
Мроіцца час той былы:
Дзічка ў гародзе цвіла,
Лебедзь за лодкаю плыў.
29.4.1985

x x x

Гляджу—ты зноў перад вачыма,
І не дастаць цябе рукой.
Іду—і поле за плячыма,
Іду—і сонца нада мной.

А ты далей, і ўжо знікаеш,
Нібы гаворыш: дагані.
Цябе не кінуць, даганяю,
І не вярнуць з далечыні.

І зноў ты, зноў перад вачыма,
Ды не дастаць цябе рукой.
Іду—і бездань за плячыма,
Іду—і вечнасць прада мной.
9.5.1985

х х х

Пра ўсё забудуся на свеце,
І толькі пра цябе—ніколі.
Святло бяроз не згасіць вецер,
Сцяжына не закрэсліць поле.

Забудуся і ўспомню светла—
Абудзіцца ўспамін табою.
Пажоўклы ліст па хвалях ветру
Плыве і не сплыве за мною.

х х х

І прыйдзе час, і ўсё забудзеш,
І аддасі мой ліст агню.
А для цябе цяпла не будзе—
Падхопіць вецер цеплыню.

І панясе яе па свеце...
А я стаю на скразняках
І застаюся ў тваім леце,
І застаюся ў тваіх снах.

мяне сустрэне вецер ветла:
--Яна табе ўсё аддала...
Не адкажу нічога ветру
І не прыму назад цяпла.
17.5.1985

x x x

З другім сустрэну выпадкова
І нават слова не скажу.
Паўней маўчанне, чым размова,
Напоўніць словамі душу.
Назад шляхі пазамятала.
Бясконцай быць, відаць, зіме…
Я разумеў, што ты казала,
Хоць не хацеў я разумець.

x x x

Хоць жанчыну не кахаеш,
Да жанчыны прывыкаеш.
Прывыкаеш--
не адвыкнуць,
Так балюча—
ды не крыкнуць.
Ды не крыкнуць—
сцяты зубы,
І жанчына шэпча: “Любы”.
Шэпча “любы”—
не кахае,
Непрывыкла прывыкае.
Прывыкае—
невыносна,
Невыносна, злосна-злосна.
…Пакідаеш—
адчуваеш,
Бы ад сэрца адрываеш…

x x x

Вы мне даруйце за маўчанне,
Калі магчыма даравáць.
Я слоў не знаю апраўдання,
Маўчанне нельга апраўдаць.

І я не знаў пра вас нічога,
Нібы не разумеў святла.
Я быў самотны, як дарога,
Што на чужыну пралягла.

ЦІШЫНЯ

Цішыня мая сумуе.
Ад журбы не ўпершыню
Цішыня мяне ратуе,
Уратую—цішыню.

Выйду ў поле, азірнуся.
Усміхнуся сам сабе.
--На пагорку не будуйся,
Гром хаціну разаб'е.

Пабудую, заспяваю.
І падзякую сябрам—
Ім раздам усё, што маю,
Толькі хаты не аддам.

І журбу паклічу ў хату,
Зачыню яе замком.
Цішыня хай будзе рада.
Разаб'е хаціну гром.

х х х

Я свой лёс вінаваціць не буду,
Калі ў цемры сцяжыну згублю.
Узгадую у полі цяпельца,
Свае сумныя вершы спалю.

Прыйдзе воўк, пасівелы і ціхі,
І прысядзе насупраць мяне.
Што ж, і зверу ахвота пагрэцца,
Пакуль спее на воблаках снег.

Вецер ранішні цемру развее,
І туман у траве не ўляжыць.
Воўк завые, і камень я кіну,
І сабе пападу па душы.

x x x

Ападае лісцё,
                    ападае—
Разарвалі вятры цішыню.
І прыходзіць часіна падумаць.
Пасядзець аднаму ля агню.

Адлятаюць знаёмыя птушкі,
Зарастае туманам прастор.
Я гляджу ў паніжэлае неба,
Падкідаю галінкі ў касцёр.

І самотны дымок весялее,
Абдымае мяне аж да слёз.
Пасвятлела ў бярэзніку шэрым—
Дзядзька ехаў,
                    саломы натрос.
7.9.1983

x x x

Яшчэ учора думаў: як сустрэць?
Яшчэ учора мог сказаць: кахаю.
І на сямі вятрах касцёр гарэў,
А сёння й попелу не адшукаю.

І я табе нічога не скажу,
І ты не скажаш мне нічога.
І будзе дождж, і я сярод дажджу,
І, нібы дождж, бясконцая дарога.

Я запыню машыну, дам рубель,
А трэба будзе, дам шафёру болей.

Ён завязе далёка ад цябе,
Але з дажджу не вывезе ніколі.

x x x

Яшчэ была нядаўна сном,
Цяпер жа — мой глыбокі сум.
Ты гронку, поўную святлом,
Сама разбіла аб расу.

Па вёсках водгулле ішло,
Будзіла ў хатах шэры смех.
Ад гронкі — аж да зор святло,
А ранкам —
густа выпаў снег.

Цікаўныя глядзелі з хат,
Пыталіся: «Ідзеш куды?..»
Яна ішла праз снежны сад,
І снег не засыпаў сляды.

x x x

Жанчына прыехала з вёскі
І сыну дарунак нясе.
Забылася нумар кватэры
І звоніць усім, па чарзе.
— Заходзьце, ды мух не пускайце.
— Што трэба?
Кажыце жвавей.
— Скажыце вы мне, калі ласка,
— А дзе мой Мікола жыве?

І дзядзька
ўсміхаецца крыва:
— Суседзяў не знаю, як зваць.
— Паспаць хаця дайце ў нядзелю,
За тыдзень трашчыць галава.

...Папраўіла моўчкі хусцінку
На светлай, як дзень, галаве.
І звоніць усім і пытае:
— А дзе мой Мікола жыве?

## ЧАРГА Ў ЗАВУЛКУ

За кніжкамі чарга ў завулку,
З чаргой ніяк не размінуцца.
— Паэт сапраўдны прадаецца.
— Паэты, брат, не прадаюцца.

Жанчына да прылаўка лезе:
— Якога колеру, памеру
У вас тут кніжкі? Пакажыце!..
— Сучаснага.
— Я вам не веру.

— Мне дзесяць штук,
ды самых моцных! —
Злуецца дзядзька, тыча грошы.
— Паэт харошы?
— Не чытала,
Але ўсе кажуць, што харошы.

Чарга завулак затапляе,
Чарзе паветра не хапае...
Стаяць цярпліва кнігалюбы,
Пыл падымаюць кнігагубы.

х х х

З верхняга паверха
Працякла вада.
Дзядзька кінуў есці,
Закрычаў:
— Бяда!!

Толькі там

на версе
Дзверы на замках.
Выбегла жанчына:
— Залівае! Жах!

Збегліся суседзі.
— Не шкадуй дзвярэй!
— Я ламаць баюся.
— Кліч людзей хутчэй!

Перакрылі краны
І пайшлі дамоў...
Зноў сабрацца змогуць,
Як залье ізноў.

x x x

Цяпер у горадзе жывеш,
На туфлі боты памяняла.
Купіла модны капялюш.
Ды гарадской — не стала.

Сярод сяброўак гарадскіх
Цану сабе ты набіваеш:
— На дзвюх я мовах гавару.
— Ты ні адной цяпер не знаеш.

Ідзеш па горадзе начным,
Зірнуўшы сумна ўслед трамваю.
І часта спатыкаешся —
Карэнні дрэў
асфальт
ламаюць.

РОДНАСЦЬ

Прыйшоў аўтобус — людзі рады.
Дахаты хочацца, дахаты.
Шафёр крычыць:

— Вы мне глядзіце
Аўтобус не перакуліце!

Загарадзіла цётка дзверы
Вялікім клункам, не пралезці.
— Свінням набрала хлеба есці?
— Ды не, унучак, тут шпалеры.

— Куды з сабакам лезеш, браце?
— Людзям тут месца не хапае.
— А ты б сядзела, баба, ў хаце.
— Не баба я, я маладая.

Шумяць вяскоўцы на вакзале.
Пакуль вось лезуць, дык злуюцца.
Залезуць, весела смяюцца:
— Лепш гумавы б аўтобус далі.

— Не прадыхнуць, што за духоцце.
— У цеснаце, ды не ў бядоце.
Пайшоў аўтобус — людзі рады.
Дахаты хочацца, дахаты.

2

КАЗКА ПРА ПОШУК

І хадзіў Іван па зямлі,
І шукаў Іван птушку сінюю,
Птушку сінюю, крылле белае.
І насіў з сабой каля сэрца
Зерне спелае, зерне добрае.
Маці дома жыла пасівелая,

Маладая яшчэ, але хворая.
Зарастала ля хаты лебядою
Поле чорнае, урадлівае.
І жыла ў сяле дзеўка бедная,
Дзеўка бедная, ды працавітая,
Што кахала Івана, чакала.

А Іван хадзіў па зямлі
І шукаў Іван птушку сінюю,
Птушку сінюю, крылле белае.
І памерла матуля сівенькая,
І хаціна ўся разваліласся,
Поле ўсё зарасло лебядою,
Выйшла замуж дзеўка бедная,
Дзеўка бедная, ды працавітая,
Што кахала Івана чакаючы.
І згубіў Іван на чужой зямлі
Зерне добрае, зерне спелае...
А шукаў Іван птушку сінюю,
Птушку сінюю, крылле белае.

## КАЗКА ПРА ХЛЕБ

Жыў стары са старой,
Зямлю аралі, хлеб нажывалі,
І было ў іх сямёра дзяцей.
— Выраслі, дзеткі,
Трэба й справай заняцца.
Кім жа хочаце стаць? —
Так спытаўся бацька,
Так спыталася маці.
— Я хачу быць вучоным.
— Быць хачу падарожнікам.
— Я хачу быць артыстам.
— Я ваенным хачу быць.
— Стану медыкам я.
— Ну а я — педагогам.
— Прадаўцом хачу быць,—
Адказалі дарослыя дзеці,
Адказалі і ў свет пайшлі.
Хутка да мэты дзеці ішлі,
Толькі час ішоў хутчэй.
І памерла маці,
І бацька памёр.
Хто ж цяперака будзе
Зямельку араць ды жніва чакаць?

x x x

Белы воран над полем ляцеў,
Чорны заяц па полі скакаў,
І валун у даліне гарэў—
Колькі год яго дзядзька шукаў!

Ён вадою валун абліваў,
Ды агонь уздымаўся вышэй.
І гарэла сухая трава,
І рабілася неба цямней.

--Ну навошта яго я шукаў,
Раз забраць немагчыма дамоў?—
Ён сябе і валун праклінаў
І прыносіў ваду зноў і зноў…

Зразумеў, што дарэмна шукаў,
І з усмешкай на свет паглядзеў:
Белы заяц па полі скакаў,
Чорны воран над полем ляцеў.

ЛЯСУН

Ён русалцы ля вады пяе,
Шчодра сыпле
                залатое лісце.
Хоць русалка слухае яго,
Толькі не жадае з рэчкі выйсці.

А смяецца,
                пырскае
                                вадой:
— Да Ягі ідзі, стары, у сваты.
А лясун гаворыць ёй сваё:
— Жонкай будзеш, пабудую хату.

ЯСТРАБ

Ён на двор Сымонаў прылятаў
І сядзеў падоўгу на страсе.
--Ты яго забі,-- сусед казаў.—
Не заб'еш, ён жонку панясе…

І паслухаўся яго Сымон,
Сабе стрэльбу ў горадзе купіў—
Шэсць разоў страляў па птушцы ён
І на сёмы раз яе забіў.

Жонка выйшла на аціхлы двор,
Птушку падняла, абмыла кроў
І пайшла, смуткуючы,
                                        у бор—
Не вярнулася дамоў.

x x x

Кола коціцца праз велькі луг
Па сцяжыне, што ў падворак мой.
— Гляньце, гэта шчасце да мяне
      З неба колам коціцца само.

Спіцы залатыя аж гарань!
Я даўно-даўно чакаў яго.
Дзеці шумна ўслед за ім бягуць.
— Шчасця не чапайце вы майго!

...Абмінула мой пустэльны двор,
Не спынілася ў маёй траве,
А ў суседкі стала ля дзвярэй,
А суседка ў полі на жніве.

СЫПКА

Бацька сыну скрыпку перадаў:
--Не глядзі, што вельмі ўжо старая.

Ды мяне у людзі, помні сын,
Вывела яна, а не другая.

Сын зайграў, як толькі мог іграць.—
І сябе людзьмі назвалі людзі.
Ды прыйшоў з другою чалавек:
--На, вазьмі, яна мацней граць будзе.

Словы бацькавы не ўспомніў сын,
Памяняў ён скрыпку на чужую.
Выйшаў да людзей, пачаў іграць—
Толькі музыкі ніхто не чуе.

## РАБІНА

Прыйшла рабіна да мяне
З пустым вядром:
— Вады налі...
Па парах маладыя ўсе
Сядзелі птушкі на галлі.

Я ўстаць хацеў, але — не змог.
І бачыў:
дым пайшоў у сад,
Прынёс з калодзежа вады,
Людзей пужаючы ля хат.

Рабіна моўчкі ў лес пайшла.
Па полі высахлым, пустым
Услед за ёй з вядром вады
Ішоў кляновы дым.

## ВІХЛА

Ляжыць на вуліцы віхла —
Як трэску расшчапіў пярун.
Спыніўся ля віхлы Антось:
— Яе на дровы забяру.

— Віхлу мой бацька пасадзіў.
Суседка шпарка падышла.
— Твайго шчэ бацькі не было,
— А ўжо тады была віхла.

Каля віхлы перабылі
Усе вяскоўцы за паўдня.
Апошнім дзед Ігнат прыйшоў
І шапку зняў.

## БАЛАДА ПРА КАВАЛЯ

...Прывялі каваля ў ланцугах.
Князь устаў,
                    даў напіцца вады:
--Меч зрабі, каб я ўсіх перамог,
І цябе адпушчу я тады!

І згадзіўся каваль:
                              -- Я зраблю...
Яго ў кузню на ноч завялі.
Звон
        аж зоры
                    страсаў на зямлю
І вуголле
                кацію
                            па зямлі.

А як сонца ўзышло,
                              звон заціх.
--Меч нясіце мне!—
                              князь загадаў.
...Ды каваль князю выкаваў плуг
І наранак сканаў.

х х х

Ранкам зайшла жанчына:
— Пpацаю жыць пара...

Ён адказаў ёй злосна:
— Лепей ідзі з двара.

Моўчкі пайшла жанчына
Вуліцай за сяло.
А за сялом злілася
З жытам,
зямлёй,
святлом.

З поля прыйшла суседка:
— Маці ў цябе была...
Клікаць пачаў матулю,
Але яна не прыйшла.

## ГЛІНЯНАЯ ПТУШКА

З пагорка хлопец
гліну
Дамоў нясе ў кашы.
--Ты што ляпіць сабраўся?
--Што-небудзь для душы.

Замкнуўшыся ў майстэрні,
Ён дзень і ноч ляпіў.
І птушку, як жывую,
На ганку пасадзіў.

Прыходзілі вяскоўцы,
Хвалілі, хто як мог…
На птушку майстар глянуў
І кінуў аб парог.

## х х х

На зарослай кустамі гары,
Дзе даўно ўжо ніхто не бывае,
Узвышаецца замак стары,
З яго раніцай сонца ўсплывае.

Прывід-князь там, гаворацъ, жыве.
А ў цямніцы замкнута князёўна.
Там калодзеж у дымнай траве
Ноччу свеціцца слёзнаю поўняй.
Я для смеласці стрэльбу узяў
І пайшоў на гару сярод ночы.
З мяне гучна лясун рагатаў
І туман напускаў мне у вочы.
У цямніцы ў густой цішыні
Галасіла аб волі князёўна.
Я цямніцу хутчэй адчыніў,
А там птушка лятае—і цёмна.

## ПАЭЗІЯ

Яна з'явілася, як прывід, з ночы.
Сказала позіркам: "Ідзі за мной…"
Услед, нібыта раб яе, пакрочыў
Па горадзе, залітым цішынёй.

Пад раніцу мы выйшлі ў поле.
--Куды вядзеш, скажы? Што хочаш дам,
Ды толькі волю не аддам ніколі!
--Яе мне сёння ўжо пддаў ты сам…

Я кляў яе і ёй маліўся шчыра.
Уцёкшы ад яе, шукаў—ізноў.
--Нашто мяне ў палон свой заманіла?
--Цябе ніхто не гнаў. Ты сам пайшоў.

## ІКАР

Наперадзе сусвет,
А за табой — зямля.
А крыл ужо няма,
Не будзе і пасля.

Ты праз вякі ляціш,
Мы за табой ляцім.

Хоць раз, але ўзляцець
Патрэбна ў жыцці.

Не ведаеш сябе,
Ды ведаеш прастор.
Ты даляцеў да нас,
Не даляцеў да зор.

Але ляціш, ляціш.
Услед гляджу здаля.
Наперадзе сусвет,
А за табой —
Зямля.

х х х

Шукаю вялікі валун.
Хачу у падмурак пакласці
Хаціны, якую раблю...
У ёй будзе жыць маё шчасце

За мною мурашкі бягуць.
Валун дапамогуць данесці.
Высока крыляе жаўрук,
З прамення прадзе свае песні.

Хаджу па лугах і палях.
Злуюся на травы густыя.
Я шмат валуноў адшукаў,
Ды толькі яны ўсе не тыя.

Шукаю вялікі валун.
Хачу у падмурак пакласці
Хаціны, якую раблю...
У ёй будзе жыць маё шчасце.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год

# ЗМЕСТ


Дрыготкія зоры Сусьвету…
*** Асьвяціла нябёсы…
*** А талент ад душы…
*** Рыпіць старэнькі калаўрот…
*** Адвечныя думы зямныя…
*** Ён прыходзіў штодня да ракі…
Франьцішак Багушэвіч
*** Яшчэ хапае ў сьвеце зла…
*** Сонцу вечна ўзыходзіць над намі…
Кузьма
Дзядзька Мікола
Хведар
*** Ужо каторы дзень…
*** Нам не належыць гэты сьвет…
*** Хата анямелая, сівая…
*** Ня чутна даўніх песень…
*** Засыпалі ў вёсцы калодзеж…
Навальніца
Дома
*** Мы шмат абяцаем…
Эцюд
Ля кастра
*** Ад ветру у фортцы разьбілася шыба…
*** Гайнёю быстраю ляціць…
*** У рэчцы вымерзла вада…
*** Празь лес я ехаў нейк ураньні…
*** Сумую па ўсьмешках…
*** Сыходзіць сьнег, змывае сьмецьце…
*** Захочаш крычаць – толькі рэху пачуць…
*** Мы касьцёр распалілі. Гаворым…
Невядомай дзяўчыне
*** На небе маладзік сьлязой…
*** Я намаляваў цябе…
*** Я вас даўно забыў…
*** Дзе, дзе ж раней ты была?..
*** Гляджу – ты зноў перад вачыма…
*** Пра ўсё забудуся на сьвеце…
*** І прыйдзе час, і ўсё забудзеш…
*** З другім сустрэну выпадкова…
*** Хоць жанчыну не кахаеш…
*** Вы мне даруйце за маўчаньне…
Цішыня
*** Я свой лёс вінаваціць ня буду…
*** Ападае лісьцё, ападае…
*** Яшчэ учора думаў: як сустрэць?..
*** Яшчэ была нядаўна сном…
*** Жанчына прыехала зь вёскі…

Чаргаў завулку
*** Зь верхняга паверха...
*** Цяпер у горадзе жывеш...
Роднасьць

II

Казка пра пошук
Казка пра хлеб
*** Белы воран над полем ляцеў...
Лясун
Ястраб
*** Кола коціцца празь велькі луг...
Скрыпка
Рабіна
Віхла
Балада пра каваля
*** Раптам зайшла жанчына...
Гліняная птушка
*** На зарослай кустамі гары...
Паэзія
Ікар
*** Шукаю вялікі валун...

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год